## З радзімы Ігната Буйніцкага

Сапраўдным падарункам можа быць для вас выступленне нашага лялечнага тэатра Батлейка. Чым яно незвычайнае? А тым, што знаходзіцца наша школа ў аг.Празарокі на радзіме самога Ігната Буйніцкага – пачынальніка беларускага тэатра.



Мы плануем ладзіць выступленні праз **інтэрнет-платфому ZOOM.** Дзякуючы гэтай магчымасці далучыцца да нашай каляднай пастаноўкі могуць усе жадаючыя.

**ZOOM!!! ZOOM!!! ZOOM!!!**




**ДУА «Празароцкая дзіцячы сад-сярэдняя школа Глыбоцкага раёна імя І.Ц.Буйніцкага»**

Адрас: 211817, вул. Цэнтральная, 24А , аг.Празарокі Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці

Тэлефон: 8 (02156) 3 64 47
Тэлефон: 8 (02156) 3 64 37
Факс: 8 (02156) 3 64 37


*ДУА «Празароцкая дзіцячы сад-сярэдняя школа Глыбоцкага раёна імя І.Ц.Буйніцкага”*

# “Батлейка – беларускі народны лялечны тэатр: інавацыі на аснове адраджэння традыцый. Кантактны тэатр з элементамі эмацыянальнай тэрапіі”



**Далучайцеся да свята!**

**Нас аб'ядная інтэрнэт-платформа ZOOM!**

# Як усё пачыналася…



На базе ДУА “Празароцкая дзіцячы сад-сярэдняя школа Глыбоцкага раёна імя І.Ц.Буйніцкага” працуе гуртох *“Спадчына”* і аб’яднанне па цікавасцях *“Юныя фалькларысты”*, мэтай якіх з’яўляецца вывучэнне мясцовай традыцыйнай спадчыны беларускага народа, а таксама далучэнне да самабытнай побытавай культуры нашых продкаў. Першым праектам, які вучні разам з настаўніцай, **Кузняцовай Святланай Іванаўнай,** захацелі рэалізаваць і ператварыць у жыццё стаў беларускі народны лялечны тэатр – батлейка.



# З гісторыі да сучаснасці

Сцэнай для самаробных лялек служылі батлейкі — спецыяльна зробленыя пераносныя скрынкі, што сваім знешнім выглядам нагадвалі хатку з адным ці некалькімі паверхамі. Лялькі мацаваліся на драўляных або металічных кіёчках. З іх дапамогай батлеечнік вадзіў лялек па шчылінах, якія прарэзваліся на кожным паверсе. Спектаклі суправаджаліся музыкай і спевамі, сцэна і лялькі асвятляліся свечкамі. Старажытныя Каляды па часе супадаюць з рэлігійным святам нараджэння Хрыста. Таму на Каляды ў лялечным тэатры паказвалі сцэны, звязаныя з гэтай падзеяй.

**Скрыню** для Празароцкай батлейкі выканаў у старажытнай тэхніцы майстар Глыбоцкага Дома рамёстваў **Віктар Баляслававіч Дудкевіч.**



**Лялек** зрабілі ўдзельніцы аб’яднання па цікавасцях “Майстэрня цудаў” Пінскага каледжа УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С.Пушкіна” на чале са сваім кіраўніком, выкладчыкам каледжа, **Наумчык Таццянай Васільеўнай.**

Лялькі з’яўляюцца дзеючымі мадэлямі і функцыянуюць на дротавых каркасах. Дэталі (галава) лялек выпаўнены тэхнікай лепкі халодным фарфорам з наступным роспісам акрылавымі фарбамі. Для пашыва адзення выкарыстаны льняная і трыкатажная тканіна, мех, цясьма, пража, ніткі, сінцепух.



Усе персанажы тэатра жывыя, з імі можна павітацца, паразмаўляць, парукацца.



Менавіта кантактнасць нашага тэатра з’яўляецца асаблівасцю, якая вылучае нас сярод іншых!





